Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 44 (58) Панядзелак, 17 верасня 1945 г.

**17 ВЕРАСНЯ СПОЎНІЛАСЯ ШЭСЦЬ ГОД УЗ'ЕДНАННЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў АДЗІНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ.**

## ВЯЛІКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СВЯТА

Сёння беларускі народ адзначае знамянальную дату ў сваім жыцці—шостую гадавіну ўз'еднання беларускіх зямель у адзіную совецкую дзяржаву.

У выніку вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі ўсе народы нашай краіны атрымалі магчымасць самастойнага развіцця. Па ініцыятыве Леніна і Сталіна была створана Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка. Беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць, атрымаў права развіваць сваю гаспадарку і культуру.

Але ў цяжкі для маладой совецкай дзяржавы час, у верасні 1920 года белапольскім імперыялістам удалося захапіць частку тэрыторыі Беларусі. Беларускі народ быў штучна раз'яднаным на дзве паасобныя часткі. З таго часу зусім па-рознаму складалася жыццё працоўных заходніх і ўсходніх абласцей Беларусі.

Совецкая Беларусь, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў, пры актыўнай дапамозе брацкіх народаў, з адсталай быўшай царскай ускраіны ператварылася ў адну з перадавых совецкіх рэспублік. За годы совецкай улады Беларусь пакрылася густой сеткай фабрык і заводаў, электрастанцый і МТС, калгасаў і саўгасаў. Расквітнелі гарады і вёскі. У пачатковых, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах навучалася 2,5 мільёны дзяцей і моладзі.

Зусім па іншаму шляху пайшло развіццё заходніх абласцей. Каля палавіны беларускіх сялян у Польшчы былі пазбаўлены зямлі. Лепшыя землі займалі памешчыкі. Аб тым, у якім цяжкім становішчы знаходзілася частка сялян, яскрава гавораць наступныя факты. Толькі ў нашым раёне было 185 сялянскіх гаспадарак, не маючых зямлі, 320 гаспадарак, якія мелі да 1 гектара зямлі. А 19 памешчыцкіх маёнткаў мелі 28.912 гектараў зямлі. Фашысцкі ўрад Польшчы пазбавіў беларускіх дзяцей школы, праследваў беларускую мову, культуру.

Толькі ў 1939 годзе, пасля развалу польскай дзяржавы, у выніку вызваленчага паходу Чырвонай Арміі працоўныя Заходняй Беларусі былі вызвалены з-пад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Новая эпоха адкрылася ў жыцці працоўных. Малазямельныя і беззямельныя сяляне атрымалі ад совецкай улады сотні тысяч гектараў быўшай памешчыцкай і кулацкай зямлі. Хутка будаваліся і ўступалі ў строй новыя фабрыкі і заводы, школы, клубы, тэатры, больніцы. З кожным днём паляпшалася жыццё працоўных.

Нямецка-фашысцкія захопнікі, якія вераломна напалі на нашу Радзіму ў чэрвені 1941 года, нанеслі нашай народнай гаспадарцы цяжкія раны. Але беларускі народ, які мужна змагаўся з нямецкімі захопнікамі, з утроенай энергіяй працуе над тым, каб хутчэй адбудаваць разбураныя гарады і вёскі, зрабіць жыццё яшчэ больш шчаслівым.

Беларускі народ, кіруемы партыяй Леніна—Сталіна, і надалей будзе працаваць не пакладаючы рук над тым, каб залячыць раны, нанесеныя вайной народнай гаспадарцы, дабіваючыся новага росквіту соцыялістычнай Радзімы.

## Дзякуй роднай совецкай уладзе

У горы і пакутах жылі мы, сяляне, пры буржуазна-памешчыцкай Польшчы. Лепшыя землі, сенажаці, лясы былі памешчыцкімі. А нам не было дзе і рук прыкласці. Не маючы сваёй зямлі, сяляне вымушаны былі ісці да памешчыкаў і кулакоў батрачыць. Так 10 год батрачыла і я з мужам у памешчыка Дрэноўскага. Працавалі ад усхода сонца і да цемна, а ніколі не мелі куска хлеба.

У 1939 годзе ўзышло сонца свабоды. Прышла наша родная совецкая ўлада, і мы ўбачылі свет. З рук совецкай улады мы атрымалі зямлю, нам дапамаглі набыць карову, каня, сталі даваць грашовую дапамогу на многадзетнасці. Жыццё было радасным і шчаслівым.

Гітлераўскія бандыты парушылі нашу мірную працу. Яны хацелі адабраць ад нас гэта светлае жыццё, зрабіць нас сваімі рабамі. Але ім гэтага зрабіць не ўдалося. Вялікі Сталін паслаў сваіх сыноў, якія дабылі нам волю і свабоду. Зноў мы жывем у дружнай сям'і совецкіх народаў. Мяне совецкая ўлада надзяліла зямлёю, аказвае грашовую дапамогу на многадзетнасці, чацвёра дзяцей вучацца ў школе. Ім адкрыта дарога ў жыццё. Дзякуй совецкай уладзе, вялікаму Сталіну за шчаслівае жыццё.

**Сцепаніда Шуміла,**
сялянка вёскі Гарадзец.

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

У гэтым годзе ў нашым раёне 1.716 малазямельных і беззямельных сялянскіх гаспадарак атрымалі 6.434 гектары зямлі з былых памешчыцкіх і кулацкіх маёнткаў.

У раёне працуе 53 школы, у якіх навучаецца 5.280 дзяцей працоўных.

